# ВОДГУК

на аўтарэферат дысертацыі А.І. Калтачэнка
“Адукацыйныя падарожжы магнатаў Вялікага Княства Літоўскага ва ўніверсітэты Заходняй Еўропы ў XVI–XVIII стст.” на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя

Разглядаемы аўтарэферат дысертацыі А.І. Калтачэнка ўяўляе сабой выклад мэты, задач, асноўных палажэнняў і вынікаў дысертацыйнага даследавання аўтара, якое прысвечана вывучэнню адукацыйных працэсаў у Вялікім Княстве Літоўскім (далей – ВКЛ) у XVI–XVIII стст. Азнаямленне з аўтарэфератам дазваляе сцвярджаць, што дысертацыя адпавядае пашпарту спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя. Структура і змест аўтарэферата дысертацыі А.І. Калтачэнка адпавядаюць патрабаванням ВАК.

Даследаванне мае актуальнасць і навізну. Яго вынікам ёсць не толькі поўны комплексны агляд такой з’явы, як адукацыйныя падарожжы магнатаў ВКЛ, але і выяўленне месца і сувязі беларускіх земляў з агульнаеўрапейскімі працэсамі развіцця навукі і адукацыі, іх ролі і ўплыву на культурнае, рэлігійнае, палітычнае жыццё дзяржавы і рэгіёна Усходняй Еўропы ў XVI–XVIII стст.

Даследаванне грунтуюцца на базе разнастайных пісьмовых крыніц, у тым ліку з замежных архіўных збораў, якія ўводзяцца ў навуковы зварот. У цэлым можна адзначыць карэктнае выкарыстанне аўтарам метадаў і крыніц даследавання, што забяспечвае дакладнасць атрыманай інфармацыі і тых высноў аўтара, якія грунтуюцца на іх.

Структура дысертацыі, падзел на главы і раздзелы адпавядае пастаўленым задачам даследаванне, якія паслядоўна разглядаюцца ў тэксце. Характарыстыка глаў і раздзелаў у аўтарэфераце дазваляе скласці адэкватнае ўяўленне пра дысертацыю. Назвы глаў і раздзелаў адпавядаюць свайму зместу.

Вынікі дысертацыйнага даследавання А.І. Калтачэнка апублікаваныя ў дастатковым аб’ёме. Яны прадстаўлены ў 24 навуковых публікацыях, з якіх 6 ўваходзяць у Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў. Адзначаныя публікацыя самастойна падрыхтаваны аўтарам. Асноўныя вынікі дысертацыі прайшлі апрабацыю на 15 рэспубліканскіх і міжнародных навукова-практычных канферэнцыях.

Станоўча трэба адзначыць той факт, што матэрыялы дысертацыйнага даследавання ўкаранёныя ў навучальны працэс кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін турызму і гасціннасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры», а таксама ўключаны ў тэкст навучальнага дапаможніка па дысцыпліне «Гісторыя падарожжаў і турызму».

Перспектыўнай ёсць і далейшая інтэграцыя вынікаў даследавання як у адукацыйны працэс, так і ў турыстычна-экскурсійную дзейнасць у якасці матэрыялаў для складання інфармацыйных блокаў для кантрольных і індывідуальных тэкстаў. Актульнай задачай з’яўляецца стварэнне экскурсійна-пазнавальных выязных маршрутаў для грамадзян Рэспублікі Беларусь з акцэнтам на гістарычныя і культурныя сувязі Беларусі з краінамі наведвання, у тым ліку для адукацыйных падарожжаў беларускіх школьнікаў і студэнтаў.

На падставе аўтарэферата можна зрабіць выснову, што дысертацыйнае даследаванне А.І. Калтачэнка з’яўляецца самастойнай навукова-даследчыцкай працай, якая будзе карыснай для спецыялістаў у галіне гісторыі ВКЛ, гісторыі адукацыі і культуры, гісторыі ідэй і навукі.

Як сведчыць аўтарэферат, аўтар выканала пастаўленыя даследчыцкія задачы, сфармулявала арыгінальныя высновы, якія ўносяць уклад у айчынную навуку. Істотных заўваг, які б маглі ўплываць на якасць і атрыманыя вынікі даследавання не выяўлена. Лічу, што А.І. Калтачэнка заслугоўвае прысуджэння ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя.

Кандыдат гістарычных навук,
Намеснік старшыні праўлення
Рэспубліканскага саюза
турыстычнай індустрыі — Д.В. Скварчэўскі

Подпись Д.В. Скворчевского удостоверяю
Председателем правления РСТИ Ф.А. Тулой

Республика Беларусь, г. Минск
Рэспубліка Беларусь, г. Мінск
Республиканский союз туристической индустрии
Рэспубліканскі саюз турыстычнай індустрыі